# У АТАКУ ВЁЎ ПАЎЛОВІЧ

Гэтага чалавека ў дывізіі любілі. Быў ён не з тых дабрачкоў, што пахлопваюць па плячы пасля першага знаёмства, а шчодра расчынены партсігар лічаць абавязковым атрыбутам гутаркі "па душах". Заўсёды падцягнуты, крыху сухаваты ў размове, ён хваліў падначаленых не часта, а патрабаваў шмат і пастаянна. Пасада абавязвала. Намесніку камандзіра дывізіі палкоўніку Івану Міхайлавічу Паўловічу клопатаў хапала.

Але калі ўжо ён хваліў каго, то пахвала гэтая запаміналася надоўга. Бо раптам высвятлялася, што негаваркі палкоўнік умее знайсці такія словы, ад якіх рабілася цёпла на сэрцы.

А можа справа была ў іншым?.. Пачуць пахвалу сваім баявым дзеянням ад самога палкоўніка Паўловіча – што-небудзь ды значыла! Гэта ж быў той палкоўнік, які ў самых цяжкіх баях вёў першы ланцуг атакуючай пяхоты, той, хто мог пасля атакі, якая захліпнулася, узняць залёгшых салдат і дабіцца поспеху.

...24 чэрвеня 1944 года дывізія пачала наступленне на магутны, глыбока эшаланіраваны абарончы рубеж гітлераўцаў за ракой Друць. Ужо адгрымела кананада артпадрыхтоўкі, ужо рвануліся ў расчышчаныя сапёрамі на мінных палях калідоры танкі з байцамі штурмавых груп. Цяпер чарга за пяхотай. З назіральнага пункта камандзіра 1343-га стралковага палка намеснік камандзіра дывізіі Паўловіч бачыў, як узняліся батальёны, як спачатку асцярожна, а потым усё смялей і смялей рушылі ўперад салдаты.

І раптам ажыў адзін з участкаў варожай абароны. Застракаталі схаваныя ў дзотах кулямёты, адкрылі агонь мінамётныя батарэі. Другі батальён палка спыніўся і залёг. І тады частка кулямётаў ворага адкрыла агонь па флангах суседніх батальёнаў. Атака магла захліпнуцца.

Ад назіральнага пункта да залёгшага батальёна палкоўнік Паўловіч бег. Сэрца калацілася так, быццам хацела вырвацца з грудзей. У 48 год такія прабежкі лёгка не даюцца. Толькі на мінуту лёг ён побач з салдатамі ў ланцугу і, стрымліваючы перарывістае дыханне, гучна запытаў:

– Загарацць ляглі, хлопцы?

– Дык жа фрыцаў там шмат. І б’юць... – пачаў апраўдвацца малады салдат.

Але палкоўнік не даслухаў яго.

– Шмат гаворыш?.. А ты ў баі ворага не лічы. Вось паб’ём іх, тады і палічым.

Ён стаў ва ўвесь рост і спакойна, як на вучэннях, скамандаваў:

– За мной!

І потым ужо для тых, хто побач:

– Пойдзем фрыцаў лічыць.

Батальён кінуўся ў атаку. Адным з першых уварваўся ў траншэю фашыстаў Паўловіч. Ён асабіста знішчыў некалькі гітлераўцаў. Убачыў, як малады салдат, той, што побач ляжаў у ланцугу, спрытна кінуў супрацьтанкавую гранату ў амбразуру дзота.

...У поўдзень палкоўнік пазваніў у штаб дывізіі:

– Абарона прарвана. Полк прасоўваецца паспяхова.

...Праз месяц яго не стала. Іван Міхайлавіч узначаліў дзеянні нашых падраздзяленняў па адбіццю магутнай танкавай контратакі ворага пад вёскай Навіннікі Брэсцкай вобласці. Смяротна ранены, ён паспеў яшчэ ўбачыць, як палаюць дзесяткі сталёвых страшыдлаў з чорнымі крыжамі, як бягуць уцалелыя фашысты.

Так закончылася нядоўгае, але яркае жыццё былога сялянскага хлапчука з вёскі Нашкавічы Мсціслаўскага раёна, воіна-камуніста, Героя Савецкага Саюза Івана Міхайлавіча Паўловіча

**У атаку вёў Паўловіч // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1970. — 18 ліпеня. — С. 4.**